Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “ДЗЕЯСЛОЎ ЯК ЧАСЦІНА МОВЫ. ГРАМАТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ ДЗЕЯСЛОВА”

па дысцыпліне “Беларуская мова”

для спецыяльнасці:

1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск

2019

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## ЗМЕСТ

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Дзеяслоў як часціна мовы. Класіфікацыя дзеясловаў паводле агульнага граматычнага значэння дзеяння ў часе або працэсу: дзеясловы руху, перамяшчэння ў прасторы, мыслення, маўлення і інш.

1.2. Граматычныя катэгорыя дзеяслова:
- пераходнасці-непераходнасці;
- зваротнасці-незваротнасці,
- стану,
- трывання,
- ладу,
- часу.

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 1. Тэарэтычны раздзел

## 1.1. Дзеяслоў як часціна мовы. Класіфікацыя дзеясловаў паводле агульнага граматычнага значэння дзеяння ў часе або працэсу: дзеясловы руху, перамяшчэння ў прасторы, мыслення, маўлення і інш.

***Дзеяслоў*** – самастойная часціна мовы, якая абазначае дзеянне ці стан, прымету прадмета як працэс і выражае яго ў граматычных катэгорыях трывання, стану, асобы, ладу, часу.

Слова “працэс” у характарыстыцы дзеяслова мае шырокае значэнне. Дзеясловы могуць абазначаць:

- канкрэтнае фізічнае значэнне (*малаціць, жаць, чытаць, пісаць*);

- перамяшчэнне ў прасторы *(ісці, ехаць, бегчы, ляцець*);

- мову і думку (*гаварыць, разумець, разважаць*);

- успрыняцце (*бачыць, слухаць*);

- адносіны асобы да каго-, чаго-небудзь (*любіць, кахаць, ненавідзець, паважаць)*;

- стан (*спаць, драмаць, маўчаць*);

- змену прыметы ці стану (*разумнець, сталець, святлець, жаўцець* і інш.).

Значэнне дзеяння ці стану маюць некаторыя назоўнікі, прыметнікі, безасабова-прэдыкатыўныя словы, але гэтыя дзеянні ці стан у іх не ўяўляюцца як працэс (параўн. *малацьба – малаціць, жоўтае лісце і лісце жаўцее, ноччу марозна і ноччу марозіць*).

Сінтаксічная функцыя дзеяслоўных форм неаднолькавая. Спрагальныя формы выконваюць у сказе ролю выказніка: *Прайшлі гады, і хмараў дым сышоў, заззялі зоры* (Бр.). Неазначальная форма дзеяслова можа быць любым членам сказа. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе выступаюць у сказе пераважна ў ролі даданых членаў сказа.

## 1.2. Граматычныя катэгорыя дзеяслова

Дзеяслоў мае граматычныя катэгорыі стану, трывання, ладу, часу, асобы, ліку і роду.

Паводле адносін дзеяння, выражанага дзеясловам, да аб’екта ўсе дзеясловы падзяляюцца на ***пераходныя і непераходныя***.

***Пераходныя*** дзеясловы абазначаюць дзеянне, якое накіравана, пераходзіць на аб’ект і кіруюць назоўнікам у форме вінавальнага склону без прыназоўніка: *жаць жыта, касіць траву.* Такі аб’ект пры пераходных дзеясловах называецца ***прамым***. Пераходныя дзеясловы могуць кіраваць назоўнікам і ў форме роднага склону без прыназоўніка:

- калі дзеянне накіравана на частку аб’екта (*адрэзаць хлеба);*
- калі пры дзеяслове ёсць адмоўе ***не*** (*не выканаў задання);*
- пры дзеясловах, якія выражаюць жаданне (*жадаць поспехаў, прасіць літасці*);
- пры дзеясловах з аб’ектам часовага карыстання (*пазычыць веласіпеда, даць ручкі*).

Пры пераходных дзеясловах можа і не быць прамога аб’екта, але ён падразумеваецца: - *Давай крыху перачакаем, - сказаў Лабановіч (К-с).* Значэнне прамога аб’екта можа мець і дадаeveryная дапаўняльная частка ў складаназалежным сказе: *Ведай жа, што свой парог і ў горы дапаможа.*

Аб’екты пры пераходных дзеясловах могуць абазначаць назвы асоб і жывёл, канкрэтных неадушаўлёных прадметаў, што ўзнікаюць у выніку дзеяння (*пабудаваць мост*) ці існавалі да пачатку дзеяння (*азеляніць вуліцу*), абстрактных паняццяў (*губляць надзею*).

Дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне, што ўскосна пераходзіць на прадмет, называюцца ***ўскосна-пераходнымі***. Яны не могуць мець пры сабе прамога дапаўнення ў форме вінавальнага склону без прыназоўніка. Аб’ект дзеяння пры такіх дзеясловах выражаецца назоўнікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі ці без прыназоўнікаў, акрамя вінавальнага склону без прыназоўніка: *перашкоджваць ворагу, дапамагаць бацькам, камандаваць атрадам, гуляць у шашкі*.

***Непераходныя*** дзеясловы называюць дзеянне, не накіраванае непасрэдна на аб’ект (*адпачываць, бялець*), Яны абазначаюць фізічны і псіхічны стан (*спаць, хварэць*), рух (*ісці, ляцець*), занятак (*настаўнічаць*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яны могуць кіраваць любым ускосным склонам без прыназоўніка і з прыназоўнікам. Слова, якім кіруе дзеяслоў, пры іх можа і не быць: *хадзіць у грыбы, збірацца ў школу, ехаць, абрадавацца, дамовіцца.*

Пераходныя дзеясловы становяцца непераходнымі, калі да іх далучаецца постфікс *-ся (-ца, -цца)*: *убачыць – убачуся, убачыцца; вучыць – вучуся, вучыцца; вярнуць – вярнуся, вярнуцца*.

Пераходнасць-непераходнасць дзеяслова ў некаторай ступені залежыць таксама ад лексічнага значэння і словаўтваральнай структуры. Да непераходных адносяцца адыменныя дзеясловы з суфіксамі *–іча-ць, -ніча-ць, -ствава-ць, -е-ць, -э-ць*: важнічаць, адсутнічаць, падарожнічаць, філасофстваваць, а таксама дзеясловы, утвораныя ад выклічнікаў і гукапераймальных слоў: *ахкаць, ухкаць, бэкаць*. Адыменныя дзеясловы з суфіксамі *–і-ць, -ы-ць* – пераходныя: *бяліць, сушыць, тармазіць*.

Дзеясловы падзяляюцца на ***зваротн***ыя і ***незваротныя. Зваротныя*** дзеясловы маюць у сваім складзе постфікс *–ся (-ца, -цца)*. Гэты постфікс служыць для ўтварэння новых слоў і новых граматычных форм таго самага слова. Напрыклад, *сябры ўбачыліся, дзеці вымыліся* – у гэтых дзеясловах постфікс *–ся* словаўтваральны, бо тут маем асобныя словы ў параўнанні з адпаведнымі дзеясловамі. Калі пры далучэнні постфікса *-ся (-ца, -цца)* утвараюцца новыя формы залежнага стану, тады ён мае формаўтваральнае значэнне: *маланка неба расшчапіла – неба расшчапілася маланкай, дзеці збіраюць кветкі – кветкі збіраюцца дзецьмі*.

Многія непераходныя дзеясловы не ўтвараюць зваротнай формы: *расці, ненавідзець, цвісці, ехаць, плысці, млець* і інш. З другога боку, ёсць такія дзеясловы, што ўжываюцца толькі ў зваротнай форме: *смяяцца, саромецца, каласіцца, гневацца, ганарыца, нездаровіцца*.

***Стан*** – граматычная катэгорыя дзеяслова, якая выражае адносіны дзеяння да суб'екта (утваральніка дзеяння). Дзеянне можа быць накіравана або не накіравана на суб'ект. З улікам гэтага выдзяляюць два станы – незалежны і залежны.

Дзеясловы ***незалежнага стану*** абазначаюць дзеянне, утворанае суб'ектам і накіраванае на аб'ект: *Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей* (Ц.); *Пры дарозе б'е нізкі паклон кучаравы лянок валакністы* (Хв.).

Дзеясловы ***залежнага стану*** абазначаюць дзеянне, накіраванае на суб'ект. Пры гэтым утваральнік дзеяння (прадмет ці асоба) выконвае ў сказе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ролю дапаўнення (ужытае звычайна ў творным склоне): *Белым снегам укрылася вуліца* (Багд.); *Працай шліфуецца талент* (Мяж.); *Пякучым болем сціснулася сэрца* (Лыньк.). Дзеясловы залежнага стану ўтвараюцца толькі ад пераходных дзеясловаў пры далучэнні да іх постфікса *–ся* або *–цца* і ўтвараюць пасіўную канструкцыю, параўн.: *Дзеці прыносяць кнігі – Кнігі прыносяцца дзецьмі. Хор спявае песню – Песня спяваецца хорам.* Дзеясловы залежнага стану ўтвараюцца ад дзеясловаў незалежнага стану, таму заўсёды суадносныя з імі: *грыбы збіраюцца – збіраць грыбы, задачы рашаюцца – рашаць задачы.* Некаторыя дзеясловы зусім не маюць значэння стану: *ляжаць, стаяць, бегчы, сінецца, бялецца, смяяцца, старацца* і інш.

Катэгорыя ***трывання*** дзеясловаў паказвае на адносіны дзеяння да яго мяжы, закончанасці. Ахоплівае ўсе формы дзеяслова.

Дзеясловы ***незакончанага*** трывання выражаюць працяглае, незакончанае дзеаянне, якое паўтараецца, не дасягае пэўнай мяжы, выніку: *пісаць, адказваць, рашаць, выхоўваць.* Дзеясловы ***закончанага*** трывання выражаюць дзеянне, якое паказвае на яго вынік, закончанасць, мяжу: *падпісаць, адказаць, рашыць, выхаваць.* Гэтае дзеянне можа быць імгненнае, аднаразовае: *стукнуць, глянуць, крыкнуць.* Значэнне закончанасці дзеяння мае толькі форма закончанага трывання прошлага часу*: пасеяў, вылечыўся.*

Дзеясловы незакончанага і закончанага трывання, лексічнае значэнне якіх супадае, утвараюць суадносную трывальную пару. Такія дзеясловы адрозніваюцца толькі граматычна: *чытаць – прачытаць.* Калі адрозніваюцца і лексічна, то пар не ўтвараюць: *капаць – перакапаць* (будзе – *перакопваць – перакапаць).* Спосабы ўтварэння суадносных трывальных пар :

1) суфіксальнае – утварэнне незакончанага трывання ад закончанага пры дапамозе суфіксаў: *апраўдаць – апраўдваць, атрымаць – атрымліваць, аб'яднаць – аб'ядноўваць, рашыць – рашаць.* Ад некаторых дзеясловаў форма незакончанага трывання можа ўтварацца з дапамогай двух суфіксаў *-а- (-я-)* і *-ва-, -іва- (-ыва-)* або *-оўва-*: *падмяніць – падмяняць, падменьваць.* Гэты спосаб уласцівы і для ўтварэння дзеясловаў закончанага трывання ад дзеясловаў незакончанага трывання як прыставачных (*высахаць – высахнуць*), так і беспрыставачных, якія абазначаюць мнагакратныя дзеянні, з дапамогай суфікса *-ну-* са значэннем аднакратнасці, імгненнасці дзеяння (*стукаць – стукнуць*);

2) прыставачнае ўтварэнне: дзеясловы закончанага трывання ўтвараюцца ад дзеясловаў незакончанага трывання пры дапамозе прыставак:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*а-, аб-, вы-, ад-, з- (с-, са-), на- , па-, пад-, пера-, пра-, пры-, раз-, у-, уз-.* Найбольш прадуктыўныя з іх: *па-, на-, з- (с-, са-), а- (аб-): бяліць - пабяліць, пужаць – напужаць, малаціць - змалаціць, шаляваць – ашаляваць.* У сучаснай беларускай мове няма такіх прыставак, якія служаць толькі для ўтварэння трывання. Тыя самыя прыстаўкі могуць быць і словаўтваральнымі, і формаўтваральнымі;

3) чаргаванні ў аснове (карані). Невялькая колькасць дзеясловаў утварае судносныя пары трывання шляхам чаргавання ў карані: нуль гука чаргуецца з ***і, ы*** у форме незакончанага трывання (*назваць – называць, выбраць – выбіраць*);

4) змена месца націску: дзеяслоў закончанага трывання мае націск на прыстаўцы ці карані, а незакончанага – на суфіксе *-а-* (*-я-*): *вы́клікаць – выкліка́ць, рассы́паць* -- *рассыпа́ць, раскі́даць – раскіда́ць*;

5) суплетывізм асноў: *легчы – класціся, узяць – браць* (рэдкія).

Ёсць дзеясловы, што не ўтвараюць суадносных пар. Гэта так званыя ***няпарныя (аднатрывальныя)*** дзеясловы. Форму толькі закончанага трывання маюць дзеясловы: *разгаварыцца, расплакацца, сурочыць, рынуцца;* незакончанага – *адсутнічаць, дзейнічаць, ганарыцца, нездаровіцца.* Некаторыя дзеясловы не маюць паказчыкаў трывання. Яны сумяшчаюць значэнне закончанага і незакончанага трывання і маюць назву ***двухтрывальныя*** дзеясловы:*адрасаваць, акцэнтаваць, матываваць.* Значэнне трывання такіх дзеясловаў звычайна вызначаецца ў кантэксце: *Атрад атрымаў загад – атакаваць станцыю, узарваць вагоны з гаручым* (закончанае трыванне, бо *ўзарваць* – закончанае, незак. *узрываць*).

Катэгорыя **ладу** дзеясловаўабазначае адносіны дзеяння ці стану да рэчаіснасці. Дзеянне можа быць рэальным: *рашаю, рашаў, буду рашаць* ці нерэальным -- пажаданым, неабходным, магчымым: *рашай, рашаў бы.* У залежнасці ад гэтага выдзяляюцца тры лады дзеяслова: абвесны, загадны і ўмоўны.

**Абвесны лад** выражае сцвярджэнне ці адмаўленне дзеяння, якое рэальна працякае ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе*: Мы вітаем вас, будучых спецыялістаў Прыйшоў жаданы час спаткання. Не развітаюся ніколі са школай.* Не мае спецыфічных марфалагічных паказчыкаў. Мае катэгорыю роду (толькі гэты лад), а таксама катэгорыі асобы і ліку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Загадны лад** паказвае, што асоба пабуджае каго-небудзь выканаць дзеянне як загад, патрабаванне, просьбу, заклік і інш., гэта можа тычыцца і неадушаўлёных прадметаў. Загаднаму ладу ўласцівы асобая інтанацыя і экспрэсіўнасць.

Утварэнне формаў загаднага ладу:

***1-ая асоба адзіночнага ліку***: не ўтвараецца

***2-я асоба адзіночнага ліку***: *-і, -ы* (*апрані, насі, кажы, скачы, бі, пі*),

нулявы канчатак (*маж, цеш, глянь, думай, мый).*

***2-я асоба множнага ліку***: *-і, -ы* , нулявы канчатак + постфікс *-це*

( *апраніце, насіце, мажце, гляньце, мыйце*).

***3-я асоба адзіночнага і множнага ліку***: *хай* (*няхай*) + формы цяперашняга ці будучага простага часу 3-й асобы адзіночнага ці множнага ліку (*хай апране, няхай мыюць*).

***1-я асоба множнага ліку***: *-ем* (*-эм, -ам*), *-ім* (*-ым*) (*нясем, напішам, сходзім),*

*давай (давайце*) + дзеяслоў будучага часу, інфінітыў (*давай сустрэнем, давайце сябраваць)*;

канчатак *-ма*, які ўжываецца толькі пасля зычных: *рэжма, кіньма, уцякайма, чытайма, будзьма.*

Асноўнымі, тыповымі для загаднага ладу з’яўляюцца формы 2-ой асобы адзіночнага ліку. Яны ўтвараюцца ад асновы цяперашняга ці будучага часу. У адзіночным ліку канчаткі: *-і, -ы* ўжываюцца ў дзеясловах, у аснове цяперашняга часу якіх няма *–й-* і якія ў 1 асобе адз.л. маюць націск на канчатку: *валаку – валачы, палю – палі*. Ненаціскны канчатак *-і, -ы* маюць дзеясловы загаднага ладу з прыстаўкай *вы-*, са збегам зычных у аснове і ненаціскным канчаткам у 1 асобе адз.л.: *выгрузі, помню – помні,* а таксама дзеясловы *біць, віць, ліць, піць.* Форма заканчваецца на зычны, калі: аснова дзеяслова цяперашняга часу заканчваецца на мяккі зычны, шыпячы, *й, р* (*вудзяць – вудзь, плачуць – плач, рашаюць – рашай, жмурацЬ – жмур*). Некаторыя дзеясловы з асновай на парны цвёрды зычны ў форме загаднага ладу маюць аснову на мяккі зычны (*глянуць – глянь, сядуць – стань, даць – дай, есці – еш).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Формы 1-й асобы множнага ліку часам называюць формамі сумеснага дзеяння. Яны або спецыфічныя для загаднага ладу: *нясем, хадзем (* канчаткі *-ем, -эм* пад націскам), або супадаюць з формамі будучага простага часу абвеснага ладу (*напішам, сходзім*), дзе вялікую ролю адыгрывае інтанацыя.

Формы 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку таксама аналітычныя. Яны выражаюцца спалучэннем часціцы *няхай (хай)* з формай цяперашняга ці будучага простага часу 3-й асобы адзіночнага або множнага ліку: *няхай расце, няхай цвіце, хай стараецца; няхай разважаюць, няхай пішуць, хай запомняць.*

Формы загаднага ладу не ўтвараюцца ад дзеясловаў *магчы, хацець, балець,* ад безасабовых дзясловаў тыпу *вечарэць, марозіць* і інш.

Формы загаднага ладу могуць ужывацца ў значэнні іншага ладу. Напрыклад: умоўнага: *Скажы палешукам пра школу – будуць смяяцца;* абвеснага: *Толькі і ведаў тады, зараджай, страляй, ляці ў атаку* (адценне мадальнасці – неабходнасці, вымушанасці дзеяння).У дзеясловах мовы і думкі аслабляецца інтанацыя загаду, сціраецца часам значэнне дзеяння: *Скажы ты, як змяніўся горад.*

Пабуджэнне да дзеяння можа выражацца не толькі формамі загаднага ладу, але і:

- інфінітывам (С*таяць на месцы!),*
- формай 2 асобы будучага часу абвеснага ладу (*Вернешся і чакай мяне*),
- прыслоўем (*Ціха,- шапнуў Косця,-, гэта вавёрка*).

**Умоўны лад** абазначае дзеянне як магчымае пры пэўных умовах. Мае аналітычную форму: дзеяслоў у форме прошлага часу + часціца *бы (б*). Часціца *бы (б)* можа знаходзіцца ў любым месцы сказа пры дзеяслове ці пры іншых словах у сказе: *Чорнае мора зялёным назваў бы, як толькі заціхнуць і бура, і шторм. Мацней бы хацелася верыць і людзям, і дружбе.* Часціца *бы* ўжываецца пасля слоў, якія заканчваюцца на зычны гук, а часціца *б* – пасля слоў, якія заканчваюцца на галосны гук.

Дзеясловы ўмоўнага ладу змяняюцца па родах і ліках, маюць формы трывання: *дапамог бы, дапамагла б, дапамагло б, дапамаглі б; малаціў бы, змалаціў бы,* але не маюць форм часу і асобы. Асоба можа выражацца з дапамогай асабовых займеннікаў: *Вам, вядома, цяжка мяне пазнаць. Я таксама вас ніколі не пазнаў бы* (К.Ч.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзеясловы ўмоўнага ладу часцей за ўсё выражаюць магчымае дзеянне, ажыццяўленне якога залежыць ад іншага дзеяння ці абставін: *Не пісаў бы, не складаў бы я вас, думы-песні, каб не вецер шызакрылы, вецер напрадвесні (*М.Танк); ужываюцца пераважна ў складаных сказах, дзе адна ці некалькі частак змяшчае ўмову; могуць мець значэнне меркавання, якое звязана з супрацьпастаўленнем : *Мы, змораныя,ля сасны зрабілі б свой прывал, ды лыжаў след, як дзве струны, пралёг праз перавал (* М.Танк); абазначаюць пажаданасць дзеяння: *Хутчэй бы прыйшла вясна.*

Дзеясловы ўмоўнага ладу ўжываюцца ў значэнні абвеснага ( у сцвярджэннях-меркаваннях: *Хацела б вас перасцерагчы)*, загаднага (для перадачы просьбы, парады з адценнем нерашучасці: *А ты, Аленка, пачытала б мне яшчэ што-небудзь*). У значэнні ўмоўнага ладу ўжываецца інфінітыў, калі да яго далучаецца часціца *бы*: *Мне б самому пазнаць свет пуцінамі рознымі, хоць бы раз праплысці акіянамі грознымі* (Бр.).

Катэгорыя ***часу*** дзеясловаўвыражае адносіны дзеяння ці стану да моманту гутаркі. У сучаснай беларускай мове дзеясловы маюць формы трох часоў: цяперашняга, прошлага і будучага.

Катэгорыя часу звязана з трываннем. Дзеясловы незакончанага трывання маюць формы трох часоў – прошлага, цяперашняга і будучага складанага: *малаціў, малачу, буду малаціць*. Дзеясловы закончанага трывання маюць формы двух часоў – прошлага і будучага простага: *змалаціў, змалачу*. Катэгорыя часу ўласціва толькі формам абвеснага ладу. Загадны і ўмоўны лад форм часу не маюць.

Дзеясловы **цяперашняга часу** паказваюць, што дзеянне адбываецца ў момантам гутаркі. Яны бываюць толькі незакончанага трывання. Дзеясловы цяперашняга часу змяняюцца па асобах і ліках: *працую, працуеш, працуе; працуем, працуеце, працуюць*. Паказчыкамі граматычных значэнняў асобы і ліку з'яўляюцца асабовыя канчаткі. Сістэму формаў цяперашняга часу складаюць тры асабовыя формы адзіночнага ліку і тры множнага ліку. Цяперашні час можа ўжывацца ў значэнні прошлага: *Дзядзьку ў рыбе шанцавала. Бывала, пострыжкі папravіць, на шчупакоў нясе і ставіць* (Колас); будучага, калі дзеянне залежыць ад суб'екта, яго жадання: *Праз два гады заканчваю ўніверсітэт.*

**Будучы час** выражае дзеянне, якое будзе адбывацца ці адбудзецца пасля моманту гутаркі: *Я ад зямелькі крыллем адштурхнуся і абміну ў палёце чорны жах* (Генію́ш). Будучы час мае дзве формы -- сінтэтычную (будучы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

просты) і аналітычную (будучы складаны). Простая форма будучага часу мае тыя самыя канчаткі, што і форма цяперашняга часу: *закончу, закончыш, закончыць; закончым, закончыце, закончаць*. Знешне адрозніваецца просты будучы час ад цяперашняга толькі прыстаўкамі ці суфіксамі, з дапамогай якіх утвараецца закончанае трыванне: *веру – паверу, вязу – прывязу, устаю – устану.*

Складаная форма будучага часу ўтвараецца ад асабовай формы дзеяслова *быць* і інфінітыва асноўнага дзеяслова незакончанага трывання: *буду маляваць, будзеш маляваць, будзе маляваць, будзем маляваць, будзеце маляваць, будуць маляваць.*

Будучы просты час ужываецца ў значэнні прошлага часу для выражэння непрацягласці, імгненнасці (закончанасці) дзеяння, якое паўтаралася: *Вецер вые, не сціхае, дзіка ў коміне шуміць, то заплача, заспявае, то па стрэсе пабяжыць* (К-с). У значэнні цяперашняга часу будучы просты ўжываецца ў апісаннях: *На арэшніку – коцікі; днём, калі пацяплее, і пад вечар на іх ажывае пылок; кранеш галінку – успыхнуць, як бенгальскія агні, клубочкі-выбухі зеленавата-жоўтага колеру* (Б.).

Дзеясловы **прошлага** часу  абазначаюць дзеянне, якое адбывалася ці адбылося да моманту гутаркі: *Свой лёс мы самі выбіралі не на гады, а на вякі* (Панч.). Формы прошлага часу ўтвараюцца ад асновы інфінітыва з дапамогай суфікса *–л-(-ў)* і канчаткаў: для мужчынскага роду – нулявы, для жаночага роду -- *-а*, для ніякага роду – *-а (-о),* для множнага ліку -- *-і: вучыць – вучыў, вучыла, вучыла, вучылі; жыць – жыў, жыла, жыло, жылі.* У дзеясловах прошлага часу мужчынскага роду, аснова інфінітыва якіх канчаецца на зычны, суфікс *-л-* пасля зычнага не ўжываецца: *несці – нёс, лезці – лез, стрыгчы – стрыг, берагчы – бярог.*

Прошлы час некаторых дзеясловаў на *-сьці* ўтвараецца ад усечанай асновы інфінітыва (без зычнага *с*): *весці– вёў, вяла, вяло, вялі*.

Калі інфінітыў канчаецца на *-чы* пасля галоснага ці *ў*, то ў формах прошлага часу аднаўляецца *к*: *валачы – валок, валакла, валакло, валаклі; таўчы – тоўк, таўкла, таўклі.*

Дзеясловы, якія абазначаюць змену стану тыпу *мокнуць, сохнуць*, у прошлым часе страчваюць суфікс *-ну-*: *кіснуць – кіс, кісла, кіслі: сохнуць – сох, сохла, сохлі.* Толькі асобныя дзеясловы з гэтай групы могуць утвараць паралельныя формы з суфіксам *-ну-* і без яго: *вянуць – вянуў, вянула, вянулі* і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*вяў, вяла, вялі; горкнуць – горкнуў, горкнула, горкнулі* і *горк, горкла, горклі; павіснуць – павіснуў, павіснула, павіснулі* і *павіс, павісла, павіслі.*

Дзеясловы прошлага часу змяняюцца па ліках і родах: *везці – вёў, вяла, вялі;* бываюць незакончанага і закончанага трывання. Прошлы час незакончанага трывання абазначае дзеянне як факт мінулага. Такія формы прошлага часу ўжываюцца пры апісаннях: *Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень. На вуліцы, як і раней, мітусіўся снег. Яго белая заслона закрывала будынкі і дрэвы. Навокал усё гуло, трэслася, выла, скуголіла* (К-с).

Дзеясловы прошлага часу закончанага трывання абазначаюць дзеянні, якія адбыліся ў мінулым: *Малінавае сонца пазалаціла зубчастыя верхавіны лесу, замігцела чырвонымі і сінімі іскрынкамі на расе, на пабітым асенняй іржою лісці шыпшынніку* (Грах.); яны могуць паказваць на паслядоўнасць закончаных дзеянняў у мінулым: *Забілі фантаны, падняліся буравыя вышкі і на Палессі* (Хадк.), а таксама на дзеянне, якое адбылося ў мінулым, але вынік яго захаваўся і ў момант гутаркі: *Маладая раслінка стаяла пры лесе ў полі. Стары лес закрываў яе ад халодных вятроў і даваў ёй цяпло і зацішак* (К-с).

У беларускай мове апрача простай формы прошлага часу ўжываецца і складаная; яе ўтвараюць дзеяслоў прошлага часу і дапаможны дзеяслоў *быць*. Дапаможны дзеяслоў мае тыя самыя формы роду і ліку, што і асноўны: *быў пайшоў, была пайшла, было пайшло, былі пайшлі*. Такая форма сустракаецца ў гутарковай мове. Яна ўжываецца для абазначэння даўно мінулага дзеяння: *Таццяна хацела была супярэчыць, але не ўправілася сказаць і некалькі слоў* (Шам.).

У значэнні прошлага часу могуць ужывацца формы цяперашняга ці будучага часу ў спалучэнні з часціцай *бывала*: *Там жа людзі жылі, я іх ведаў, бывала, толькі выйдзеш – і сябра дастанеш рукой* (Луж.).

Дзеясловы прошлага часу могуць ужывацца ў значэнні будучага, калі дзеянне павінна адбыцца пасля моманту гутаркі: *Так я вам і паверыла! Гэта добра, вядома, калі чалавек не выхваляецца* (Лыньк.).

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

*1. Ахарактарызуйце дзеяслоў як часціну мовы.*

*2. Што могуць абазначаць дзеясловы?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Ахарактарызуйте сінтаксічную ролю дзеясловаў у сказе.*

3. *Што абазначае катэгорыя дзеяслова пераходнасці - непераходнасці?*

4. *Якія дзеясловы адносяцца да пераходных?*

5. *Што абазначаюць аб’екты пры пераходных дзеясловах?*

6. *Ахарактарызуйце ўскосна-пераходныя дзеясловы.*

7. *Якія дзеясловы з’яўляюцца непераходнымі?*

8. *Што абазначаюць зваротныя дзеясловы?*

9. *Як утвараюцца зваротныя дзеясловы?*

10. *Ці ўсе пераходныя дзеясловы могуць утвараць зваротную форму?*

11. *Што выражае катэгорыя стану дзеяслова?*

12. *Ахарактарызуйце дзеясловы незалежнага стану.*

13. *Якое дзеянне абазначаюць дзеясловы залежнага стану?*

14. *Як утвараюцца дзясловы залежнага стану?*

15. *Што абазначае катэгорыя трывання дзеяслова?*

16. *Ахарактарызуйте дзесловы незакончанага трывання.*

17. *Ахарактарызуйце дзеясловы закончанага трывання.*

18. *Што такое трывальныя пары і як яны ўтвараюцца?*

19. *Ахарактарызуйце аднатрывальныя дзеясловы.*

20. *Ахарактарызуйце двухтрывальныя дзеясловы.*

21. *Што абазначае граматычная катэгорыя ладу?*

22. *Ахарактарызуйце дзеясловы абвеснага ладу.*

23. *Ахарактарызуйце дзеясловы ўмоўнага ладу. Як яны ўтвараюцца?*

24. *Якое дзеянне абазначаюць дзеясловы загаднага ладу?*

25. *Як утвараюцца формы загаднага ладу?*

26. *Ахарактарызуйце  граматычную катэгорыю часу.*

27. *Як змяняюцца джзеясловы прошлага часу?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Спішыце, вызначце, пераходнымі ці непераходнымі з'яўляюцца дзеясловы. Вусна складзіце з імі сказы.**

Не чытаць, купіць, выпіць, любавацца, адказаць на што-небудзь, перадаць каму-небудзь, біць па чым-небудзь, перакласці на што-небудзь; ісці, спаць, хварэць, смуткаваць, мерзнуць, худзець.

**Заданне 2. Выпішыце з тэксту пераходныя і непераходныя дзеясловы. Абгрунтуйце свой выбар.**

Самыя шчырыя ўзаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі адмалку і назаўсёды "праграмуюцца" тым універсальным кодам, які выпрацаваны моваю продкаў

Кожная мова – гэта ўніверсальнейшая знакавая сістэма. Адзін гук у ёй мяняе сэнс адразу некалькіх слоў, а шматзначнае слова набывае змест толькі ў пэўным кантэксце.

Непаўторнасць матчынага Слова!

Якім шматфарбным і паэтычным убачыў і пазнаў гэты зямны свет дзякуючы табе, да якіх цудоўных скарбаў свайго народа змог прычасціцца ў натхненні?!

Чаму ж так няўдзячна атрымліваецца, што, партаціўшы на ўсведамленне і засваенне матчынай мовы гэтулькі сіл душы, асобныя з нас потым надта ж лёгка забываюць цану той навукі?.. (Паводле А. Лісіцкага)

**Заданне 3. Спішыце тэкст, выпішыце з яго зваротныя дзеясловы, падкрэсліце ў іх постфікс –ся (-ца, -цца).**

Лес стаіць яшчэ голы, але на тонкіх бярозках ужо лопаюцца пупышкі. З іх выбіваюцца клейкія лісточкі. Тонкі пах вясны і свежасці павольна плыве па лесе. На высокіх кустах алешніку красуюцца жоўтыя і зялёныя шышачкі.

Ажываюць маленькія паляны. Сярод іглiцы і леташняга лісця прачынаюцца і цвітуць пралескі. Фіялетавыя кветкі дзівосным дыванам упрыгожваюць лес, глядзяцца ў невялічкія лужынкі, што блішчаць у траве. А на нізінах пад кустамі алешніку белымі галоўкамі цягнецца да сонца ветраніца. Гэта першыя веснавыя кветкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 4. Спішыце, у дужках вызначце стан дзеясловаў.**

1. Працай шліфуецца талент. 2. Усё прыходзіць у нябыт, астаюцца толькі плёны чалавечай працы. 3. Неўзабаве Васіль Паўлавіч быў выбраны старшынёй калгаса імя Першага мая. 4. Сады агалошваюцца нястомным ціньканнем сініц. 5. Каця вельмі любіла тыя часы хвалявання, калі разлівалі расплаўлены метал па формах. 6. У вільгаці зелянілася трава, бялела наперадзе жвірыстая дарога. 7. А на дубах, як шапкі тыя. чарнеюць гнёзды буславыя. 8. Удзень вучні распускаліся на паўтары гадзіны для абеду. 9. Дзень быў святы. Яшчэ ад рання блінцы пякліся на сняданне. 10. Пан Крулеўскі назначаецца павятовым камісарам; войтаў па валасцях ставяць. 11. Усё вайною нішчыцца, усё, усё знішчаецца. 12. Ілья Капіеўскі праследаваўся іезуітамі, таму вымушаны быў пакінуць родную зямлю і перасяліўся ў Амстэрдам.

**Заданне 5. Вызначце значэнне стану дзеясловаў. Знайдзіце дзеясловы, якія ўтвараюць суадносныя па стану пары, і дзеясловы, якія выражаюць значэнне толькі пэўнага стану.**

1.Прыгожае, высокае, глыбокае — тое, што не вельмі дакладна завецца класікай — успрымалася мною на пачатку жыцця з выклічнай сілай свежасці. 2. Два гумны былі пустыя. Там заставалася толькі трохі саломы і абмеццfolk (М. Лынькоў). 3. Увесь дзень, да позняга вечара, шчыравала Хадоська: зграбала сена, зносіла з Іванкам копы, з бацькам, з маткаю, з Іванкам складвала стог (І. Мележ). 4. Успаміналіся зарослыя дзікімі грушамі і збэрсаным малціннікам і брызглінаю недагледжаныя з пазелянелымі камянямі дварчанскія могілкі (В. Адамчык). 5. Кветкі за кратамі пахнуць свабодаю! Іх забараняецца прыносіць у турмы: там гэта ўжо зброя — белыя, жоўтыя, чорныя кветкі (Я. Сіпакоў). 6. Ад шасэ дом аддзяляўся садам з чатырох яблынь і кустамі агрэсту і парэчак (Я. Маўр). 7. У гэты дзень сеялася мокрая імгла, але к вечару выяснілася і заход сонца быў чысты (К. Чорны). 8. Сябры не набіраюцца гадамі. Іх ніколі не бывае так многа, каб сказаць, што сяброў ужо досыць. Людзі сустракаюцца, дружбуюць і часта разыходзяцца, каб не звацца сябрамі (Я. Скрыган). 9. Кропля дажджу апала на зямлю. Зямля напаіла зярно. Зярно стала хлебам. Хлеб стаў песняй (М. Танк). 10. Вось і ноч. Нада мной заліліся слязамі нябёсы, смагла цягне расу ўся сухая і пыльная глеба (А. Бачыла).

**Заданне 6. Складзіце сказы з дзеясловамі залежны стану.**

Расшчапілася маланкамі; асвятляўся электралямпачкамі; уздымалася плугамі; калектывам бярэцца; мераецца сажнямі; робіцца гаспадаром, выпраўляецца настаўнікам, разносіцца паштальёнам, адпраўляецца сяброўкай.

**Заданне 7. Спішыце верш, раскрываючы дужкі. Вызначце лад і трыванне дзеясловаў.**

Каб калыскі сваёй (не)забыцца,

Каб (не)счэзнуць сярод нягод,

Прахалодай спрадвечнай крыніцы

Наталі мяне, мой радавод.

Маю памяць стагоддзям (не)вынішчыць,

Маёй сцежкі (не)звесці ў прыгнёт –

Ад маны і ад лёсу рабыніча

Беражы мяне, мой радавод.

У валошках, якім (не)выцвісці,

У вольных спевах вясновых чарод,

У Божай міласці, у людской шчырасці

Будзе доўжыцца мой радавод (Яўген Пясецкі).

**Заданне 8. Замяніце прапанаваныя словазлучэнні адным зваротным дзеясловам.**

1. Пасылаць лісты і атрымліваць іх --

2. Зняць адзенне і надзець іншае --

3. Кідаць мяч другому і лавіць кінуты ім мяч --

4. Напружана слухаць нешта слаба чутнае --

5. Зрабіць няправільна --

6. Весці барацьбу --

7. Знаходзіцца ў неспакойным стане –

**Заданне 8. Выканайце пісьмова разбор дзеясловаў па наступнай схеме: пачатковая форма, пераходны-непераходны, зваротны-незваротны, стан, лад, трыванне час, род, лік.**

Францыск Скарына жыў у вялікую эпоху Адраджэння, у той час калі адбываўся найвялікшы прагрэсіўны пераварот з усіх перажытых да таго часу чалавецтвам. Гэта была эпоха, якая мела патрэбу ў тытанах і якая спарадзіла тытанаў па сіле думкі, страсці, характару, па масштабнасці і вучонасці. Тады не было амаль ні аднаго буйнога чалавека, які не зрабіў бы далёкіх падарожжаў, не гаварыў бы на чватырох ці пяці мовах, не вызначаўся б у некалькіх галінах творчасці. Такі быў і наш Скарына.

Яго выданні зрабілі вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё кнігадрукавання ў нашай краіне – згадайма хоць бы Пятра Мсціслаўца, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага…

Першадрукар, перакладчык, мовазнавец, педагог, астраном, філосаф, медык, батанік, ён сваімі ідэямі, працаю перадвызначыў цэлыя стагоддзі ў культурнай і грамадскай гісторыі Беларусі.

Імя Францыска Скарыны свяціла нашаму народу надзеяй і вераю ў самыя цяжкія часіны беларускай гісторыі.

(А.Клышка)

**Заданне 9. Ад дзеясловаў утварыце ўсе магчымыя формы загаднага ладу. Вусна складзіце з імі сказы.**

Шукаць, услаўляць, браць, рэзаць, перадаваць, сказаць, складваць, гуляць, чытаць.

**Заданне 10. Ад дзеясловаў утварыце ўсе формы ўмоўнага ладу. Пісьмова складзіце зімі сказы.**

Віншаваць, слухацца, падумаць, паспець, зрабіць, вывучыць.